View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

Забавская ,И.И. Стан пачатковай адукацыі у пачатку XX стагодзя : гісторыяграфія пытання/ Забаўская І.І. / Актуальныя праблемы гісторыяграфіі гісторыі Беларусі і агульнай гісторыі: зб. навук. прац / Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка; рэдкал.: А.І. Андарала, М.М. Забаўскі, А.М. Люты [і інш. ]. – Мінск : БДПУ, 2012. – С. 6-12

# Стан пачатковай адукацыі у пачатку XX стагодзя : гісторыяграфія пытання

**І.І. Забаўская**
**г. Мінск, БДПУ**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Даследаванне стану пачатковай школы на тэрыторыі Беларусі ў азначаны час пачалося ў пачатку XX ст. У 1909 г. у Пецярбурзе свядомая частка беларускага настаўніцтва Віцебскай губерні выдала зборнік пад назваю “Белорусский учитель”. У прадмове рэдакцыя заявіла, што будзе асвятляць пытанні агульнай асветы, рэформы школы, а таксама змяшчаць артыкулы аб культурна-асветніцкай дзейнасці настаўніцтва. На гэту адметную ў культурна-асветніцкім жыцці падзею адгукнуўся артыкулам “Пра нацыянальную школу на Беларусі” малады беларускі пісьменнік, крытык і публіцыст С.Я. Палуян, паплечнік і сябар Я. Купалы, М. Багдановіча. А украінскі часопіс “Українська хата” у майскім № 5 за 1909 г. надрукаваў артыкул. Па сутнасці гэта было першае публічнае выступленне С.Я. Палуяна ў абарону нацыянальнай школы і роднай мовы. У развіцці народнай асветы аўтар адводзіў галоўнае месца настаўніку, менавіта пагэтаму аўтар пачынае артыкул са становішча настаўніка пры царызме і яго ролі ў грамадскім і культурным жыцці народа. С.Я. Палуян крытыкуе платформу “Белорусского общества” (утворана ў 1908 г. у Вільні. Старшыня Л.М. Саланевіч, намеснік – П.В. Каранкевіч, сакратар – П.І. Каранеўскі. Усе трое працавалі ва ўправе Палескіх чыгуначных шляхоў у Вільні. Асноўнымі мэтамі арганізацыі значыліся: уздым культурнага і эканамічнага ўзроўню беларусаў, фарміраванне іх нацыянальнай самасвядомасці “на асновах рускай дзяржаўнасці”. Ідэолагі новай арганізацыі, якая ўяўляла ліберальны варыянт «заходнерусізму» лічылі, што пачатковыя школы (народныя вучылішчы) павінны быць набліжаны да жыцця, да рэальных

патрэб сялян, даваць дзецям практычныя навыкі. "Жыццё вылучае новыя патрабаванні, новыя задачы, жыццё патрабуе людзей узброеных практычнымі, рэальнымі ведамі і школа павінна даць гэтых людзей" – пісала "Белорусская жизнь" у нумары за 1 красавіка 1911 г. [1] і артыкул п. Русавай пра гэту платформу (Русава С.В. (1856-1940 гг.) – украінская грамадская дзеячка, педагог і публіцыст. Заснавальніца і рэдактар педагагічнага часопіса "Світло". Зацікаўлена пісала і пра беларускі культурны рух). С.Я. Палуян адзначае, што без нацыяналізацыі школы на Беларусі "немагчыма рэфармаваць гэту школу; тут ужо не дапаможа ніякае пашырэнне школьных праграм" [2].

Ідэю ўсталявання беларускай нацыянальнай пачатковай школы прапагандавала і ўсімі сродкамі адстойвала газета "Наша ніва". Ужо ў першым нумары за 10 лістапада 1906 г. яна пісала: "Цёмны наш народ тутэйшы, цёмны мужык-беларус. Часта бацькі праз цемнату сваю не хочуць даць дзецям навукі, ня хочуць пасылаць іх вучыцца ў школу; а і школ у нас нехват хоць і хацеў то і ўсіх дзяцей у іх памесціць не зможэш... Але цяпер насталі лепшыя часы: зразумела і правіцельство, зразумеў і сам народ, што, каб палегшыць жыццё ўсіх працуючых, трэба перш-наперш даць ім навуку, даць можнасць ўчыцца ўсім нашым дзеткам".

У Віленскай вучэбнай акрузе (у якую ўваходзілі, акрамя Віленскай, і Віцебская і Гродзенская і Магілёўская, і Мінская губерні і інш.). У 1902 г. было 17 тыпаў пачатковых школ, якія істотна адрозніваліся адзін ад другога па змесце работы. Пад уплывам грамадска-палітычнага і нацыянальна-культурнага руху ў 1905-1907 гг. характэрныя рысы адукацыі значна відазмяніліся.

Пачатковую адукацыю давалі народныя і гарадскія вучылішчы, якія адносіліся да Міністэрства народнай асветы (МНА), а таксама царкоўнапрыходскія школы і школы пісьменнасці, якія падпарадкоўваліся царкоўнаму ведамству. Народныя вучылішчы былі двух тыпаў: аднакласавыя, ці ніжэйшыя пачатковыя, з трохгадавым тэрмінам навучання і двухкласавыя, з 5-6 гадовым навучаннем.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

На 1 студзеня 1905 г. на тэрыторыі Беларусі дзейнічала 4990 царкоўных школ (1217 царкоўнапрыходскіх і 3773 школы пісьменнасці), у якіх налічвалася 157 тысяч вучняў. Да 1908 г. у 4027 царкоўных школах колькасць навучэнцаў складала каля 144 тысяч. А да 1914 г. засталося 2813 школ, дзе навучалася 137 тысяч вучняў [3].

Гарадскія вучылішчы замянілі павятовыя, якія гралі ролю павышаных пачатковых школ для "сярэдніх" пластоў гарадскога насельніцтва – дробнай буржуазіі, рамеснікаў, служачых і інш. У асноўным яны размяшчаліся ў павятовых цэнтрах. На пачатак 1905 г. на тэрыторыі Беларусі іх налічвалася 39 з 37 тыс. навучэнцаў. Да 1912 г. іх колькасць узрасла да 82, а колькасць вучняў павялічылася да 82 тыс.

Па дадзеных перапісу за 1911 г. па Віленскай вучэбнай акрузе 52 % хлопчыкаў і 40 % дзяўчынак роднай мовай назвалі беларускую[4]. А між тым, урадавая палітыка ў школьным пытанні фарміравалася пад дамінуючым уплывам манархічных сіл, якія выступалі за "рускую нацыональную школу" пад кіраўніцтвам і наглядам царквы і ўрада. Важнейшай задачай школы, як і раней, прызнавалася выхаванне насельніцтва беларускіх губерняў у духу афіцыйнай ідэалогіі ("самадзяржаўе, праваслаўе, народнасць").

Нястомную барацьбу за ўсталяванне беларускамоўнага навучання ў пачатковай школе вяла "Наша ніва" пры падтрымцы простага люду (аб гэтым сведчылі шматлікія лісты ў рэдакцыю газеты) увесь 1908 г. [5]

Праблемы навучання на роднай мове адлюстроўваліся ў артыкуле Я. Купалы "Ці маем мы права выракацца роднай мовы" (1910 г.) [6], канцэпцыі развіцця беларускай культуры ў артыкуле "Беларусы" М. Багдановіча [7; 259, 125], канцэпцыі беларускай нацыянальнай школы В. Ластоўскага [8, 3], канцэпцыі беларускай школы Цёткі. Як рэдактар літаратурна-навуковага часопіса для беларускай моладзі "Лучынка" (першы нумар выйшаў у 1914 г.) яна ўпершыню абгрунтавала прапанову неабходнасці стварэння спецыяльнага перыядычнага органа для дзяцей і юнацтва на беларускай мове [9]. Крытычны погляд на тагачасны стан народнай асветы ў Беларусі, Літве, русіфікатарскую

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

скіраванасць школьнай палітыкі царызму адлюстроўваўся ў публіцыстычных і літаратурных творах Я. Коласа [10].

Найбольш поўнае абгрунтаванне ідэала нацыянальнай адукацыі належала выдатнаму педагогу К.Д. Ушынскаму. Яго вучэнне аб выкладанні ў пачатковай школе на роднай мове ў аднолькавай ступені адносілася як да украінскай, так і да беларускай школы. Але ў педагагічнай думцы канца XIX ст. у Расійскай імперыі канцэпцыя роднай мовы К.Д. Ушынскага не сустрэла станоўчых водгукаў [11].

Такім чынам, працэс фарміравання беларускай нацыі ў пачатку XX ст. не мог быць паспяховым без нацыянальнай (літаратурнай) мовы. Апошняя, у сваю чаргу, магла сфарміравацца толькі пры ўмове заваявання ёю месца ў пачатковай, сярэдняй і вышэйшай школе, грамадскіх установах, царкве і касцёле Беларусі. Пачатковая школа адыгравала у гэтым прцэсе важнейшую ролю. Трывалы падмурак для станаўлення беларускай педагагічнай сістэмы і дзіцячай літаратуры быў створаны ў пачатку XX ст. чытанкамі В. іваноўскага, К. качанца, Я. Коласа, В. Ластоўскага. Асаблівае значэнне ў іх надавалася фарміраванню гістарычнага мыслення і нацыянальнай свядомасці дзяцей беларусаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Літаратура:


1. Устав белорусского общества. – Вильно: Тип. «Артель печатного дела», 1909.- 16 с.
2. Палуян, С. Лісты ў будучыню / С. Палуян. – Мінск: “Мастацкая літаратура”, 1986. – С. 45.
3. Асвета і педагагічная думка ў Беларусі. Са старажытных часоў да 1917 г. / рэдкал. М.А. Ткачоў, У.С. Посэ, Г.Р. Сянькевіч [і інш.] – Мінск: Народная асвета, 1985. – 464 с.
4. Однодневная перепись начальных школ в Империи, произведенная 18 января 1911 г. / редкол.: В.И. Покровского. – СПб - Вып. 8: Виленский

учебный округ. Губернии: Виленская, Витебская, Гродненская, Минская и Могилевская, 1914. – С. 20

5. Наша ніва – 1908 // Наша ніва. Першая беларуская газета з рысункамі. – Вып. 1. – 1906 – 1908 гг. Факсімільнае выданне / Адказны за выпуск З.Н.Санько. – Мінск., 1992. – №№ 1,2,7,8,9,12,18-20,25.
6. Купала, Я. Збор твораў: у 7 т. – Мінск.: Навука і тэхніка, 1976. – Т. 7: Пераклады п’ес. Публіцыстыка. Пісьмы. Летапіс жыцця і творчасці. – Мінск.: Навука і тэхніка. – 1976. – 695 с.
7. Багдановіч, М. Поўны збор твораў: / М. Багдановіч. у 3 т. – Мінск.: Навука і тэхніка, 1993. – Т. 2. – 600 с.
8. Ластоўскі, В. Кароткая гісторыя Беларусі: з 40 рысункамі. / В. Ластоўскі. Вільня: Друк. Марціна Кухты, 1913. – 104 с.
9. Цётка. Творы. / Цётка. – Мн: Маст. Літ., 1976. – С. 270.
10. Колас, Я. Другое чытанне для дзяцей беларусаў / Я. Колас. – СПб., 1910. – 112 с.
11. Снапкоўская, С.В. Адукацыйная палітыка і школа на Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX стст. / С.В. Снапкоўская. – Мінск: Нацыянальны інстытут адукацыі. ВК. ТАА “ПоліБіг”, 1998. – С. 81-83.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ